**Акуліч Ю.У.,**
*аспірантка кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм*

# АДПАВЕДНАСЦЬ ДЗЕЙНАСЦІ ФБІС СТАНДАРТАМ ІФЛА ПА БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Удасканальванне сістэмы вышэйшай адукацыі з'яўляецца адной з важнейшых умоў культуралагічнага развіцця грамадства. Адукацыя садзейнічае фарміраванню інтэлектуальнага, культуралагічнага патэнцыялу краіны, дапамагае рыхтаваць прафесіяналаў, здольных выкарыстоўваць атрыманыя веды, творча мысліць.

Сёння вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі стаяць перад выбарам такога шляху ўдасканальвання прафесійнай адукацыі, які даў бы магчымасць рыхтаваць спецыялістаў высокага класа, здольных канкурыраваць з замежнымі калегамі.

На наш погляд, у першую чаргу неабходна выявіць адпаведнасць бібліятэчнай адукацыі міжнародным патрабаванням, што прад'яўляюць да гэтага віду дзейнасці.

Міжнародныя арганізацыі імкнуцца да таго, каб выпускнікі вышэйшых школ мелі аднолькавы статус.

У дакументах Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый указана на неабходнасць "весці працу па падрыхтоўцы міжнароднай эквівалентнасці і ўзаемапрызнання кваліфікацыі бібліятэкараў".

Ідэя стварэння стандартаў па бібліятэчнай адукацыі ўзнікла ў 1970-я гады. У 1976 г. Пастаянны кансультатыўны камітэт па бібліятэчнай адукацыі і даследаваннях ІФЛА прадставіў на сесіі ІФЛА стандарт для бібліятэчных школ, які быў разгледжаны і зацверджаны. Пасля ён пераглядаўся, дапаўняўся.

Факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (ФБІС) у Беларусі існуе ўжо 53 гады. За гэты час на ім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быў назапашаны вялікі вопыт падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. Як вядома, ніхто яшчэ не спрабаваў аналізаваць дзейнасць факультэта ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі. Мы паспрабуем разгледзець дзейнасць факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм у святле канцэпцыі стандарта Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый. У гэтым дакуменце змешчаны 18 крытэрыяў, якія прад'яўляюцца да бібліятэчных школ (факультэтаў) іх выпускнікоў.

Факультэт з'яўляецца часткай Беларускага універсітэта культуры, які ў 1996 г. прайшоў акрэдытацыю Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь. Мэты і задачы факультэта выкладзены ў статуце універсітэта. Факультэтам кіруе дэкан, які падпарадкоўваецца рэктару універсітэта.

Прафесарска-выкладчыцкі састаў ФБІС складаецца не толькі з выкладчыкаў, якія маюць спецыяльную адукацыю, але і з прафесараў, дацэнтаў, кандыдатаў навук, што ў цэлым адпавядае стандартам ІФЛА, ЮНЕСКА. Усе выкладчыкі маюць базавую адукацыю і вучоныя ступені па профілі факультэта. Стандарт дапускае не больш за 12 студэнтаў на аднаго выкладчыка, а ў нас іх прыходзіцца 8.

У адпаведнасці са стандартам любая бібліятэка павінна быць укамплектавана так, каб яе фонд забяспечваў выкананне навучальнага плана школы і каб выкладчыкі мелі адпаведныя ўмовы для паспяховай навуковай працы. Там павінен быць якасны даведачна-бібліяграфічны апарат. Колькасць выданняў у бібліятэцы школы (з разліку на аднаго навучэнца) не можа быць меншай, чым у іншых падобных установах краіны.

На наш погляд, нягледзячы на недастатковае фінансаванне, наша бібліятэка забяспечвае асноўныя патрэбы навучальнага працэсу. Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне пастаўлена тут на належным узроўні. Вядома, што нашай бібліятэцы, заснаванай каля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20 гадоў таму, цяжка спаборнічаць з бібліятэкамі універсітэтаў, гісторыя якіх налічвае некалькі стагоддзяў. Але пры дастатковым фінансаванні яна таксама магла б цалкам забяспечваць патрэбы студэнтаў і выкладчыкаў.

У нашай бібліятэцы практычна ёсць усе неабходныя прафесійныя выданні, але, на жаль, колькасць экземпляраў недастатковая. Ёсць замежныя выданні, але яны выкарыстоўваюцца рэдка.

У адпаведнасці са стандартам на спецыяльных кафедрах факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, а таксама на агульнаінстытуцкіх кафедрах ёсць кніжныя зборы па профілі кафедраў.

Вучэбныя планы ФБІС адпавядаюць міжнароднаму стандарту. Яны змяшчаюць агульнаадукацыйныя, агульнанавуковыя і прафесійныя дысцыпліны. Ёсць фундаментальныя курсы, спецкурсы. Па вучэбных планах вядзецца падрыхтоўка бакалаўраў, магістраў.

Адукацыя бібліятэкараў, якая існуе цяпер у свеце, выглядае наступным чынам: першы ўзровень — універсітэцкая адукацыя, што працягваецца 1—4 гады (адпавядае нашым бакалаўрам), другі ўзровень — 5 гадоў, або другая адукацыя (адпавядае нашым магістрам).

На наш погляд, нягледзячы на недастатковае фінансаванне, бібліятэка забяспечвае асноўныя патрэбы навучальнага працэсу. Інфармацыйна-бібліяграфічнае абслугоўванне пастаўлена тут на належным узроўні. Вядома, што нашай бібліятэцы, заснаванай каля 20 год таму, цяжка спаборнічаць з бібліятэкамі універсітэтаў, гісторыя якіх налічвае некалькі стагоддзяў. Але пры дастатковым фінансаванні яна таксама магла б цалкам забяспечваць патрэбы студэнтаў і выкладчыкаў.

У бібліятэцы ёсць практычна ўсе неабходныя прафесійныя выданні, але, на жаль, колькасць экземпляраў недастатковая. Ёсць замежныя выданні, але яны выкарыстоўваюцца рэдка.

У адпаведнасці са стандартам на спецыяльных кафедрах факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а таксама на агульнаінстытуцкіх кафедрах ёсць кніжныя зборы па профілі кафедраў.

Вучэбныя планы ФБІС адпавядаюць міжнароднаму стандарту. Яны змяшчаюць агульнаадукацыйныя і прафесійныя дысцыпліны. Ёсць фундаментальныя курсы, спецкурсы. Па вучэбных планах вядзецца падрыхтоўка бакалаўраў, магістраў.

Адукацыя бібліятэкараў, якая існуе цяпер у свеце, выглядае наступным чынам: першы ўзровень — універсітэцкая адукацыя, што працягваецца 1—4 гады (адпавядае нашым бакалаўрам), другі ўзровень — 5 гадоў, або другая адукацыя (адпавядае нашым магістрам).

Стандарт патрабуе, каб падрыхтоўка бібліятэкараў і інфарматыкаў працягвалася не менш за 5 гадоў і пасля гэтага адбывалася б прысваенне ступені магістра.

Праграма падрыхтоўкі бібліятэкараў павінна змяшчаць прынцыпы і палажэнні бібліятэказнаўства, бібліяграфіі, інфарматыкі. Навучанне звычайна складаецца з лекцый, семінараў, практыкі ў бібліятэцы. Існує 2 тыпы праграм:

1) гадавая, што грунтуецца выключна на бібліятэказнаўстве, бібліяграфіі, інфарматыцы;

2) праграма для бакалаўра, якая ахоплівае некалькі агульнаадукацыйных і прафесійных галін. Асноўны змест курса ўключае такія дысцыпліны, як каталагізацыя, класіфікацыя, арганізацыя і кіраванне, выкарыстанне тэхнічных сродкаў у бібліятэчнай справе. Падчас навучання выконваюцца таксама курсавыя і дыпломныя работы.

Заняткі па агульнаадукацыйных дысцыплінах могуць папярэднічаць прафесійнай падрыхтоўцы (як гэта робіцца зараз у нас) альбо праводзіцца разам з заняткамі па спецыяльных дысцыплінах. Стандарт раіць улічваць, што студэнты павінны спачатку вывучыць агульнаадукацыйныя курсы, а потым авалодаць спецыялізаванымі. Агульнанавуковая адукацыя павінна быць асноўным кампанентам адукацыі бібліятэкара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле стандарта вучэбны план на ўзроўні бакалаўра павінен змяшчаць асноўныя палажэнні бібліятэказнаўства і прадугледжваць вырашэнне некаторых тэхнічных пытанняў. Прафесіянал павінен ведаць не толькі, як і што робіць бібліятэка, але і чаму яна гэта робіць. Гэты падыход трэба ўлічваць пры выкладанні ўсіх курсаў вучэбнага плана.

У вучэбным плане трэба таксама прадугледжваць даследаванні, якімі кіруюць выкладчыкі (курсавыя і дыпломныя работы), розныя віды семінарскіх, лабараторных работ.

Пажадана, каб студэнты маглі абменьвацца думкамі. Кіраванне дыскусіяй ацэньваецца стандартам не ніжэй за чытанне лекцый. У навучальным працэсе павінны шырока выкарыстоўвацца сродкі тэхнічнага забеспячэння і, канечне, камп'ютэрныя тэхналогіі.

Пажадана, каб кожны студэнт меў асабістага кіраўніка, які здолеў бы дапамагчы выбраць тэмы курсавых і дыпломнай работ.

Нягледзячы на тое, што розныя школы выбіраюць фундаментальныя дысцыпліны і самі вызначаюць іх змест і колькасць гадзін, ва ўсіх школах павінен быць вызначаны спіс неабходных фундаментальных дысцыплін:

1. "Бібліятэка і грамадства" (на нашым факультэце гэтаму курсу адпавядаюць дысцыпліны "Уводзіны ў спецыяльнасць" і "Бібліятэказнаўства. Агульны курс").

2. "Прынцыпы і метады бібліяграфіі" (адпаведна "Агульная бібліяграфія" і "Методыка і тэхналогія бібліятэчнай працы").

3. "Прынцыпы і метады арганізацыі дакументаў у бібліятэцы" ("Каталагізацыя дакументаў").

4. "Прынцыпы і метады рэкамендацый і паслуг чытачам" ("Бібліятэчнае абслугоўванне").

5. "Прынцыпы і метады адбору, набыцця, выкарыстання матэрыялаў" ("Бібліятэчныя фонды").

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. "Прынцыпы і метады кіравання бібліятэкай" ("Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент і маркетынг").

7. "Гісторыя бібліятэк" ("Бібліятэказнаўства: гісторыя").

8. "Бібліялогія" ("Кнігазнаўства").

9. "Прынцыпы і метады правядзення даследаванняў у галіне бібліятэказнаўчых дысцыплін" ("Асновы навукова-даследчай дзейнасці ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і інфарматыкі").

10. "Прынцыпы і метады аўтаматызацыі" ("Выкарыстанне тэхнічных сродкаў у бібліятэцы").

11. "Прынцыпы і метады дакументацыі і інфармацыйнай навукі" ("Дакументазнаўства" і "Інфарматыка").

12. "Прынцыпы і метады планавання будаўніцтва і абсталявання бібліятэкі" (часткова гэтаму курсу адпавядае ("Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент").

Усе курсы ў адпаведнасці са стандартам павінны адлюстроўваць сучасны стан развіцця дадзенай галіны ў свеце. Нашы студэнты самастойна выбіраюць спецыялізацыю і курсы пасля паспяховага вывучэння фундаментальных дысцыплін.

Вучэбныя планы факультэта выкарыстоўваюць усе віды заняткаў, якія прапануе стандарт, змяшчаюць усе рэкамендаваныя дысцыпліны, акрамя "Будаўніцтва і абсталявання бібліятэк".

Адбор студэнтаў на факультэце, знаёмства іх з навучальным працэсам вядуцца ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі.

Адукацыйны ўзровень факультэта адлюстраваны ў спецыяльным дакуменце — дыпломе, дзе запісаны спецыяльнасць, кваліфікацыя. На жаль, студэнтаў знаёмяць з вучэбным планам толькі тады, калі выкладаюць курс "Уводзіны ў спецыяльнасць". Было б, напэўна, лепш, калі б не толькі студэнты, але і абітурыенты змаглі пазнаёміцца з вучэбным планам і атрымаць падрабязную інфармацыю пра дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Усе рашэнні ў школе павінны прымацца калектыўна. Да кіравання школай трэба прыцягваць не толькі выкладчыкаў, але і студэнтаў. Кіраўнік школы павінен рэгулярна раіцца з калектывам. У гэтым сэнсе на нашым факультэце няма праблем. Кожны месяц збіраецца рада факультэта, дзе ёсць прадстаўнікі ўсіх кафедраў (25% рады складаюць студэнты). Акрамя таго, раз у два тыдні збіраюцца пасяджэнні кафедраў, дзе таксама абмяркоўваюцца праблемы навучальнага працэсу.

Такім чынам, на наш погляд, дзейнасць факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм у асноўным адпавядае патрабаванням міжнароднага стандарта ІФЛА для бібліятэчных школ. Неадпаведнасці, якія існуюць, цяпер абумоўлены галоўным чынам слабымі матэрыяльна-тэхнічнай, фінансавай, паліграфічнай базамі факультэта.

**Абдулхамид Ахмед Муктар,**
*аспирант кафедры автоматизированных библиотечно-информационных систем*

## СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ, СОДЕРЖАНИЕ И ПРОБЛЕМЫ БИБЛИОТЕЧНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В ЭФИОПИИ

Подготовка библиотечных кадров в Эфиопии в настоящее время имеет очень большое значение. До 1956 г. библиотечное образование там можно было получить только за границей. Качество подготовки библиотекарей тогда не соответствовало потребностям библиотек.

В 1956 г. Министерством образования Эфиопии была разработана программа библиотечного образования. В ее разработке участвовали многие школьные библиотекари страны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ